Таццяна Кабржыцкая

КРАІНАЗНАЎЧЫ КАМПАНЕНТ МАСТАЦКАГА ТВОРА ЯК ПРАБЛЕМА ПЕРАКЛАДУ: ГІСТАРЫЧНЫ РАМАН У ВЕРШАХ ЛІНЫ КАСТЭНКА «МАРУСЯ ЧУРАЙ» У БЕЛАРУСКАМОЎНЫМ УЗНАЎЛЕННІ НІНЫ МАЦЯШ

Ліна Кастэнка – адна з найбольш таленавітых майстроў украінскага мастацкага слова, шырока вядомых не толькі ў славянскім свеце, але і далёка за яго межамі. Прызнанню паэтэсы ў вялікай ступені спрыяў яе раман у вершах, названы паводле імені і прозвішча галоўнай гераіні твора – «Маруся Чурай» [2]. Асоба гэтай украінскай дзяўчыны з народа, паэтэсы і спявачкі прыцягвала ўвагу літаратараў на працягу некалькіх стагоддзяў. У прыватнасці, яшчэ ў 1839 г. у Санкт-Пецярбурзе з'явілася аповесць А. Шахоўскага пад прамовістай назвай «Маруся – малороссийская Сапфо»,

у 1877 г. альманах «Пчела» (№ 6) друкуе нарыс А. Шклярэўскага «Маруся – малороссийская певунья». Зразумела, натхняла гэта гераіня і шматлікіх украінскіх творцаў. Тут варта згадаць паэта-рамантыка Л. Баравікоўскага, драматургаў М. Старыцкага і Г. Баракоўскага, празаікаў В. Кабылянскую, С. Васільчанку і многіх іншых. Вобраз Марусі, Марыі Гардзееўны Чурай, «Чураіўны» прыйшоў у літаратуру з народнай памяці, з вусных пераказаў і легенд. У фальклоры зафіксаваны і біяграфічныя падрабязнасці яе жыцця, і прыкметы вонкавага партрэту, і псіхілагізаваная характарыстыка. Насычанае драматычнымі калізіямі жыццё Марусі Чурай праступае праз тэматычную напоўненасць і эстэтычную аформленасць многіх твораў вуснай народнай творчасці. Сярод іх больш дваццаці песень, аўтарства якіх (і слоў, і мелодый), як лічыцца, належыць самой Марусі Чурай. Паэтыка гэтых твораў, іх вобразна-выяўленчыя сродкі, мелодыка вельмі блізкія да песеннай спадчыны ўкраінскага народа. Гэтыя адметнасці спрыялі папулярнасці твораў, забяспечылі ім неўміручае жыццё, як, зрэшты, і нязгасную памяць сярод украінцаў пра саму Марусю Чурай.

У аснову мастацкай інтэрпрэтацыі жыцця і творчасці гераіні, здзейсненай Лінай Кастэнка, таксама пакладзены факты і падзеі, узятыя з народнай памяці. Аднак непераўзыдзенай заслугай пісьменніцы з'яўляецца тое, што праз гісторыю жыцця прыватнай асобы яна ўзняла пытанні агульнанацыянальнай значнасці. Асабістыя якасці дзейных асоб твора Ліна Кастэнка ўпісала ў кантэкст разгорнутага аналізу ментальнасці ўкраінскага народу. Больш таго, вершаваны раман Ліны Кастэнка ў жанравым вызначэнні ўспрымаецца як гісторыка-біяграфічны твор. Глыбокае асэнсаванне гістарычных падзей таго часу, да якога належала гераіня, уменне выбраць найбольш істотнае, важкае, паказальнае, перадача патрыятычнага пафасу тых векапомных падзей, якія адлюстраваны ў творы, – усё гэта дазваляе гаварыць пра вершаваны раман «Маруся Чурай» як пра своеасаблівую нацыянальную эпапею. Краіназнаўчы, народазнаўчы субстрат у творы адыгрывае каласальную, вырашальную ролю. Ён праяўляецца ў шматлікіх па-мастацку моцна знітаваных тэкставых кампанентах. Узнаўленне такога твора на іншай мове патрабуе ад перакладчыка падвоенай працы. Поспех перакладу залежыць не толькі ад паэтычна-перакладчыцкіх здольнасцей, але і ад папярэдняга навукова-аналітычнага ўваходжання ў матэрыял.

Перад беларускай паэтэсай Нінай Мацяш, якая дала новае жыццё рамана Ліны Кастэнка на беларускай мове [1], стаялі вельмі складаныя задачы. Зразумела, неабходна было ўлічыць агульныя патрабаванні да перакладу

паэтычнага твора, такія. як эквілінеарнасць і эквірытмічнасць. У той жа час нельга было не ўлічваць і асаблівасці індывідуальна-аўтарскага стылю Ліны Кастэнка, які ў названым рамане выявіўся ці не з асаблівай яскравасцю. А гэта – спалучэнне народнага і інтэлектуальнага пачаткаў, густая вобразнасць, насычанасць метафарамі, алюзіямі, іроніяй. апеляцыя не толькі да нацыянальных святынь, але і да найвышэйшых духоўных здабыткаў усяго чалавецтва. Гэта – аўтарскае гістарычнае мысленне, здатнае ствараць сваю мастацкую традыцыю. Гэта – падача думкі і пачуцця ў такой аўтарскай манеры, якая бліскуча адлюстроўвае гістарычнае развіццё нацыянальнай мовы са складанымі змяшчэннямі і зменамі ў сярэдзіне яе лексічнай, марфалагічнай і сінтаксічнай будовы. Гэта – мера суаднесенасці нарматыўнага слова з аўтарскімі неалагізмамі, з архаікай і дыялектызмамі. У той ці іншай ступені адзначанае вышэй, як і ўвогуле ўся творчасць Ліны Кастэнка, можа лічыцца адным са шматлікіх складнікаў агульнага ўкраіназнаўства і аб'ектам адпаведных краіназнаўчых даследаванняў. Што датычыць краіназанаўства як праблемы перакладу, то ў творы Ліны Кастэнка яна таксама праяўляецца праз многія моманты.

Сярод найбольш пашыраных мастацкіх прыёмаў, якія пакліканы перадаць нацыянальную спецыфіку адлюстраванай рэчаіснасці, нельга не назваць зварот да разнастайных фальклорных жанраў. Звернем увагу на народную песню, цудоўным знаўцам якой выявіла сябе ў творы аўтарка. Тэматычная шматпланавасць песень, пры ўсёй іх лірычнай афарбоўцы, вылучэнне ў асобныя групы гераічных твораў і твораў побытавых далі магчымасць пісьменніцы стварыць псіхалагічна выразныя характары. Мы можам з абсалютнай перакананасцю сцвярджаць, што песні не толькі ляжаць у аснове сюжэтастварэння, яны фарміруюць кампазіцыйны стрыжань рамана, адлюстроўваюць палярна супрацьлеглыя характары, акрэсліваюць любоўны трохкутнік. Для прыкладу, каб супрацьпаставіць духоўнасць і гераічнасць – з аднаго боку, і будзённасць, прагматычнасць – з другога, аўтарка адпаведным чынам фарміруе песенны рэпертуар галоўнай гераіні і яе антыпода-суперніцы. У прыватнасці, сквапная і прымітыўная ў жыццёвых запатрабаваннях Галя спявае «Посіяла огірочки», «Натіпала конопель», «Ішли корови із діброви». Духоўны свет Марусі напоўнены памяццю пра гераічнае жыццё, нязломнасць яе бацькі Гардзея Чурая. Таму яе талент знаходзіць сваю рэалізацыю ў песнях – паходных маршах украінскіх казакоў. Бескампраміснасць дзяўчыны выявіцца і ў яе каханні да Грыца, трагічная развязка іх лёсу атрымлівае мастацкае адлюстраванне ў песні «Ой, не ходи, Грицю, тай на вечорниці». Аналізуючы перакладны

тэкст, звяртаем увагу на тое, што назвы ўсіх украінскіх песень у Ніны Мацяш падаюцца не на мове арыгінала, а ў перакладзе. Існуюць выпадкі, калі перакладчыкі словы ў назвах падаюць на мове арыгінала і не шукаюць жанравых адпаведнікаў у сваёй нацыянальнай фальклорнай спадчыне. Рознасць падыходаў тут відавочная, які з іх мае большыя падставы, сказаць цяжка. Сумненні выкліканы наступнай акалічнасцю: у назву песні ўваходзіць радок з вершаванага тэксту. І хто яго ведае, ці менавіта так гэтыя канкрэтныя радкі будуць гучаць, калі будзе перакладзены песенны куплет, калі свае правы заявіць усё тая ж рыфма, ці рытмічная арганізацыя вершаванай страфы, ці нешта яшчэ?

Што датычыць перадачы пры перакладзе прымавак і прыказак, то тут патрабаванні адназначныя: неабходна і думку, і афарыстычнаць яе афармлення ўзнаўляць сродкамі мовы перакладу. Ніна Мацяш выявіла глыбокую абазнанасць у скарбах народнай мудрасці і з той самай мерай дасціпнасці, што і ў арыгінале, адшукала, не спакусіўшыся ні разу на моўную кальку, адпаведныя па зместу, ідэйна-мастацкай функцыі арыгінальныя беларускія прымаўкі і прыказкі. У выпадку празаічнага перакладу такая задача вырашалася б значна прасцей, паэтычны жа тэкст патрабуе адпаведнай сцісласці славеснага аб'ёму і ёмістасці фразы, каб можна было ўкласціся ў вызначаны арыгіналам вершаваны памер і г. д. Відавочна, менавіта гэтыя акалічнасці – строгія рамкі: радок, рыфма, памер – прымусілі перакладчыка ў асобных выпадках звярнуцца да ўласна творчасці. На паперу ляглі не ўзоры народнай мудрасці, а новатворы Ніны Мацяш. Выкананыя ў народным стылі, яны таксама засведчылі майстэрнасць перакладу, паколькі няма ў іх штучнасці, манернасці і пабудаваны яны паводле законаў фальклору. Думаецца, для прыкладу, як паэтычную знаходку перакладчыка можна разгледзіць наступную фразу (хоць і ёсць тут некаторая непразрыстасць, ускладненасць выказвання): *«А хто тут, можа, хоча хабара, то хай чужым не мажа салам плечы»*.

Аднак звернемся яшчэ раз да песні. На гэты раз – засяродзіўшы ўвагу на праблеме асэнсавання перакладчыкамі такой галіны народазнаўства, як імёнаслоўе. У аснове рамана ляжаць калізіі, якія складаюць зместавае напаўненне песні «Ой, не ходи, Грицю, тай на вечорниці». Як бачым, у загалоўку пазначана імя галоўнага героя твора. У беларускім тэксце гэта імя падаецца ў адпаведнасці з аўтэнтычным гучаннем і беларускім правапісам – як «Грыц», што не выклікае пярэчанняў. Аднак аднастайнасці ў напісанні імені няма. На пачатку рамана, калі яшчэ не ўключыліся ў кантэкст твора рэмінісцэнцыі з названай песні, герой названы як «Рыгор». У гэтым кан-

крэтным выпадку такі варыянт імені не толькі неапраўданы, але і можа ўвесці чытача ў зман (нібыта тут размова ідзе пра нейкага іншага чалавека). Увогуле ж адлюстраваная ў далейшым у тэксце пераклада вернасць фальклорнай традыцыі ў напісанні імені героя, які «перанесены» ў мастацкую прастору рамана з народнай песні, нам падаецца адзіна правільным падыходам пры перадачы ўласных імён з адной мовы на іншую.

Прадметам асобнай гаворкі пры зазначанай праблеме павінна была б з'явіцца перадача многіх іншых краіназнаўчых адметнасцей твора Ліны Кастэнка. Характарыстыка этнаграфічнага матэрыялу тут праявілася праз упамінанні народных звычаяў, павер'яў, гульняў, яна ўключае таксама назвы нацыянальнага адзення і іншае, што ўважліва фіксуецца і ў перакладзе. Добры знаўца ўкраінскай прыроды, Ліна Кастэнка засяліла прастору раманнага аповеду прадстаўнікамі жывёльнага і раслінага свету роднага краю. Ніна Мацяш знайшла ў сваёй роднай мове лексічныя адпаведнікі, каларытныя беларускія словы, што ў каторы раз засведчылі развітасць беларускай мовы, яе сінанімічнае багацце. Аднак справядлівасць патрабуе адзначыць, што ў некаторых выпадках, там, дзе ў арыгінале з сінанімічнага раду Ліна Кастэнка свядома выкарыстоўвае архаічную лексіку, Ніна Мацяш уводзіць словы нейтральнага гучання. Часам гэта абумоўлена асаблівасцямі мовы перакладу, зрэдку прычыну можна ўбачыць і ў недастатковай пільнасці перакладчыка.

Гістарычная канкрэтыка рамана праяўляецца ў насычанасці твора вялікай колькасцю тапонімаў, у прыватнасці гідронімаў. Яшчэ большае значэнне для ўзнаўлення духу эпохі маюць рэальныя гістарычныя асобы: адны з іх прымаюць удзел у непасрэдным дзеянні, у разгортванні сюжэтных ліній, імёны іншых толькі ўпісваюцца ў аўтарскі аповед. Аднак усё ў сапраўдным творы мае сваё мастацкае прызначэнне, усё абдумана і ўзважана. Правільная перадача гэтага роду матэрыялу, звычайна, вельмі важная. І зразумела, што Ніна Мацяш тут не магла быць не на прафесійным узроўні. Адно толькі рака Ворскла, галоўная водная артэрыя Палтаўшчыны, у беларускім тэксце падаецца чамусці як «Ворскля», што для ўкраінскага вуха гучыць вельмі недарэчна.

Яшчэ раз падкрэслім, што і геаграфічныя, і гістарычныя рэаліі гераічнай эпохі, перададзеныя, у прыватнасці, праз назву зброі, і многія іншыя ўзноўлены ў перакладзе на беларускую мову з усёй адказнасцю. Адзначылі мы і тое, што паэтычная форма перакладу амаль беззаганная. І ўсё-такі такога мастацкага ўздзеяння на чытача рамана Ліны Кастэнка, які быў засведчаны на Украіне, у Беларусі не адбылося. Ці была ў гэтым віна пе-

ракладчыка? Ці ён аказаўся «без віны вінаватым»? Адказам на гэтыя пытанні ў некаторай ступені можа паслужыць тое, што, відавочна, спадзяваны эфект ад мастацкага перакладу не атрымаўся і ў іншых краінах. І прычыны тут у нашым выпадку зусім аб'ектыўнага парадку. Ліна Кастэнка па-майстэрску правяла ў сваім рамане ідэю нацыятворчасці. Паэтэса гістарычную канкрэтыку падала ў сканцэнтраваным выглядзе. Яна так спалучыла рэальнасць і вымысел, што дамаглася найвышэйшай ступені драматызацыі аповеду. Яна апелявала да свайго ўкраінскага чытача, падрыхтаванага да ўспрымання і асэнсавання твора папярэдняй абазнанасцю з нацыянальнай гісторыяй. Яна звярнула ўвагу суайчыннікаў на нешта вельмі важнае, на тыя падзеі, з якімі звязаныя найбольш трагічныя і найбольш гераічныя моманты жыцця нацыі. Яе ўласная мастакоўская падсветка тых падзей таксама не засталася без увагі. Іншанацыянальны чытач такога глыбіннага спасціжэння мастацкай канцэпцыі рамана Ліны Кастэнка самастойна здзейсніць не змог. А значыць, не змог адчуць і ўсю прыцягальную моц яе дзёрзкага, смелага паэтычнага таленту. Відавочна, мы гаворым пра скрытыя праявы таго, што ў перакладазнаўстве прынята класіфікаваць як «неперакладальнае ў перакладзе». Хаця ў перакладчыцкай практыцы існуюць пошукі дадатковых сродкаў і прыёмаў адэкватнасці. Не лішне тут будзе нагадаць, што побач з паэтычнымі перакладамі Шэкспіра, выкананымі на рускай мове С. Маршаком, Б. Пастарнакам і іншымі цудоўнымі майстрамі паэтычнага мастацкага перакладу, існуе пераклад М. Марозава, выкананы прозай. Яго выданне разлічана на філалагічныя патрэбы і менавіта таму суправаджаецца грунтоўным навуковым каментарыем. Марозаў імкнуўся да спецыяльнага вывучэння, да прафесійнага даследавання. Мы ж гаворым пра тую аптымальную меру інфармацыі, якая можа і павінна спрыяць паўнавартаснаму эстэтычнаму ўспрыманню ўсіх якасцей арыгінала. Па ўсім відаць, што Ніна Мацяш таксама адчувала патрэбу ўстанавіць больш цесны кантакт паміж сабою як перакладчыкам, мастацкім тэкстам і чытачом. Яна зрабіла спробу падаць некалькі дадатковых тлумачэнняў да вершаваных радкоў ў спасылках напрыканцы канкрэтнай старонкі. Аднак гэтыя памкненні амаль нічым не дапамаглі чытачу, найперш праз малаколькаснасць звестак, іншы раз і праз іх недарэчнасць. Пераклад – гэта мастацтва. Навука ж пра мастацтва абавязана раскрываць яго сакрэты. Менавіта зыходзячы з такога разумення функцыі навуковых каментарыяў мы прыходзім да перакананння, што выданне тых твораў, што моцна завязаны на краіназнаўчы аспект, павінна мець пэўную колькасць прытэкставых спасылак, у якіх бы тлумачыліся незразумелыя словы ці рэаліі. І яшчэ адна

неабходная ўмова нармальнага спасціжэння важкага твора – прысутнасць у кнізе цікава напісанага літаратуразнаўчага артыкула ў выглядзе ўступнага слова альбо пасляслоўя.

ЛІТАРАТУРА

1. *Кастэнка Ліна.* Лірыка. Маруся Чурай: Гістарычны раман у вершах / Пер. Н. Мацяш. Мн., 1989.

2. *Костенко Ліна.* Маруся Чурай: Історичний роман у віршах. Київ, 1982.